## З ВОПЫТУ РЭАЛІЗАЦЫІ ІНФАРМАЦЫЙНА-АДУКАЦЫЙНАГА ПРАЕКТА “ШКОЛА АКТЫЎНАГА ГРАМАДЗЯНІНА” У ДЗЯРЖАЎНАЙ УСТАНОВЕ АДУКАЦЫІ “КРУГОВІЦКАЯ СЯРЭДНЯЯ ШКОЛА” ГАНЦАВІЦКАГА РАЁНА БРЭСЦКАЙ ВОБЛАСЦІ

Дата правядзення 22.02.2024
Удзельнікі: вучні VIII–XI класаў

**Мэта**: фарміраванне ў вучняў уяўлення аб Узброеных Сілах Рэспублікі Беларусь, аб ваенных прафесіях, стварэнне ўмоў для выхавання пачуцця патрыятызму, павагі да людзей, якія абараняюць краіну, удасканаленне кампетэнцый актыўнага грамадзяніна.

У рамках рэалізацыі інфармацыйна-адукацыйнага праекта “Школа актыўнага грамадзяніна” 22 лютага 2024 года ў Круговіцкай сярэдняй школе прайшоў тнфармацыйны час на тэму “Радзіма мая Беларусь у асобах. Абаронцы Айчыны”.

**ШАГ 1 “МЫ ДАВЕДВАЕМСЯ”.** На першым этапе актуалізаваліся веды аб Узброеных Сілах, пагранічнай службе, мытнай службе, МНС Рэспублікі Беларусь з дапамогай інтэрактыўнай віктарыны.



Удзельнікі пашырылі свае веды пра Армейскія міжнародныя гульні (АрМІ), рыхтавалі выступленні пра дзейнасць кіналагічнай службы на мяжы і мытні, працу кіналагічных Цэнтраў у Рэспубліцы Беларусь, пазнаёміліся з унікальнай практыкай, якая арганізавана ў Цэнтрах бяспекі МНС з мэтай навучання беларусаў дзейнасці падчас надзвычайных сітуацый.




Вучні расказалі пра подзвіг лётчыкаў Карвата Уладзіміра Мікалаевіча, Андрэя Нічыпорчыка і Мікіту Куканенка, якім прысвоена ганаровае званне “Герой Беларусі”. Іх жыццё – прыклад доблесці,

гонару, гераізму і самаахвяравання. Прысутныя ўшанавалі памяць аб Героях Беларусі мінутай маўчання.

Пры падвядзенні вынікаў першага этапа было адзначана, што важнейшай задачай Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь з’яўляюцца абараназдольнасць і забеспячэнне суверэнітэту краіны.

**ШАГ 2.**

Дадзены этап праведзены ў выглядзе тэхналогіі “100 пытанняў дарасламу”. Госць мерапрыемства – Патаповіч Дзяніс Міхайлавіч, маёр у запасе, расказаў аб ваеннай дынастыі ў сваёй сям’і, матывах выбару



прафесіі ваеннага, а таксама паведаміў аб сістэме прафарыентацыйнай работы ў школе, накіраванай на выбар выпускнікамі школы прафесіі ваеннага праз рэалізацыю праекта шостага школьнага дня “Пачэсны выбар”. Дадзены праект быў прадстаўлены ў гэтым годзе на рэспубліканскім узроўні і быў адзначаны дыпломам. Дзяніс Міхайлавіч прадэманстраваў вучням відэаролікі, падрыхтаваныя выпускнікамі школы, якія па закліку сэрца выбралі ваенную прафесію і на сённяшні дзень служаць Айчыне або навучаюцца прафесіі ваеннага. У ходзе інтэрактыўнай гутаркі з Дзянісам Міхайлавічам вучні мелі магчымасць пачуць адказ на пытанне, чаму сёння надаецца вялікая ўвага абараназдольнасці краіны.



У час мерапрыемства была наладжана аўдыясувязь з выпускніком Круговіцкай сярэдняй школы Хадаском Аляксеем Грыгор’евічам, які атрымаў адукацыю на ваенна-тэхнічным факультэце БНТУ, размеркаваўся ў Смаргонскую пагранічную групу і на сённяшні час займае пасаду афіцэра кіравання дадзенай вайсковай часці. Аляксей Грыгор’евіч адзначыў, што ганарыцца тым, што абараняе Радзіму і нясе ахову Дзяржаўных межаў Рэспублікі Беларусь. Ён павіншаваў усіх з надыходзячым святам абаронцаў Айчыны і Узброеных Сіл Рэспублікі

Беларусь і пажадаў вучням школы выбіраць прафесію ваеннага як адну з самых годных і важных ва ўсе часы.

Вядучая павіншавала ўсіх з надыходзячым святам, прадставіла фрагмент віншавання Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А.Г. Лукашэнка з Днём абаронцаў Айчыны і Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь.

**ШАГ 3. "МЫ ДЗЕЙНІЧАЕМ"**

Мерапрыемства завяршылася гутаркай, у якой удзельнікі прыйшлі да высновы, што служыць Айчыне – высакародны занятак, для кожнага важна памятаць пра найвялікшую каштоўнасць у нашай дзяржаве – мір і стабільнасць, захоўваць традыцыі продкаў і выконваць свой грамадзянскі абавязак, быць гатовым служыць Радзіме.



Для таго, каб гэтыя каштоўнасці захоўваць і абараняць, у нашай краіне створаны надзейны гарант бяспекі – эфектыўныя, падрыхтаваныя, з самым сучасным узбраеннем і ваеннай тэхнікай Узброеныя Сілы.

Сёння мы з упэўненасцю можам сказаць, што нам ёсць кім і чым ганарыцца!

Дунчык Таццяна Паўлаўна,
класны кіраўнік VIII класа
дзяржаўнай установы адукацыі
"Круговіцкая сярэдняя школа"